ВОДГУК
на аўтарэферат дысертацыі Носік Алесі Анатольеўны
«Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне» на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Дысертацыйнае даследаванне А.А.Носік прысвечана сферы, якая абгрунтавана прыцягвае ўсё большую ўвагу навукоўцаў з самых розных галін ведаў. Так званыя гнуткія навыкі, або мяккія навыкі (ад англ. *soft skills*) уяўляюць сабой вельмі важны складнік надпрафесійных кампетэнцый ў большасці сфер дзейнасці, а эмацыйны інтэлект з’яўляецца іх неад’емным элементам, што павышае неабходнасць даследавання эмоцый чалавека з самых розных гледзішчаў, у тым ліку даследавання іх моўнага адлюстравання. Спецыфіка аб’екта – катэгорыі эмацыянальнасці ў сучаснай навуковай парадыгме – спрыяе міждысцыплінарнаму падыходу да вывучэння праблемы, што прасочваецца ў аглядзе папярэдніх даследаванняў, пералічаных дысертанткай на стар. 7–8 аўтарэферата. Такім чынам, *актуальнасць* даследавання не падлягае сумневу і, спадзяемся, адкрывае перспектывы да яго паглыблення і пашырэння ў будучыні за кошт вывучэння корпусу сучасных тэкстаў.

Вывучэнне спецыфікі вербалізацыі эмоцый і функцыянавання лексікі эмацыянальнай сферы чалавека, сістэматызацыя адпаведных намінацый ў беларускай мове – важны крок да стварэння грунтоўнай тэарэтычнай базы па вызначэнні асноўных прынцыпаў і механізмаў узаемадзеяння псіхалагічных і моўных структур. Даследаванне праведзена на аснове досыць аб’ёмнага і безумоўна рэпрэзентатыўнага фактычнага матэрыялу (звыш 1100 лексічных адзінак, засведчаных у больш чым 2800 тэкставых фрагментах), што спрыяе валіднасці атрыманых вынікаў. Пра грунтоўны падыход да вывучэння тэарэтычных асноў і аналізу ранейшых даследаванняў ускосна сведчыць і згаданы ў аўтарэфераце аб’ём вывучаных навуковых крыніц – бібліяграфічны спіс займае 25 старонак дысертацыі і ўключае 293 найменні работ айчынных і замежных аўтараў.

Абгрунтаванасць і дакладнасць заключных вывадаў дысертанткі забяспечваюцца не толькі шырокай тэарэтычнай базай даследавання і рэпрэзентатыўнай выбаркай фактычнага матэрыялу, але таксама прадстаўленнем колькасных дадзеных з выкарыстаннем таблічных сродкаў візуалізацыі тэарэтычных высноў (у аўтарэфераце таксама маецца адна табліца) і высокім узроўнем апрабацыі на шэрагу навуковых канферэнцый. Грунтоўнасць і навуковую мэтанакіраванасць пацвярджае таксама вялікі

спіс публікацый суіскальніцы па тэме даследавання, якія рыхтаваліся, як можна меркаваць па датах, на працягу апошніх дзесяці год.

Тэкст аўтарэферата дазваляе зрабіць выснову, што структура дысертацыі, як і аб’ём, прадыктавана мэтай і задачамі даследавання. Праца складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння і дадаткаў, з якіх, на наш погляд, самым цікавым і каштоўным з гледзішча *практычнай значнасці* можна лічыць першы ў лексікаграфічнай практыцы «Тлумачальны слоўнік намінацый эмацыянальнай сферы чалавека», укладзены дысертанткай. Структура працы ўяўляецца простай і лагічнай, асобна разглядаюцца лексічныя сродкі намінацыі адмоўных і станоўчых эмоцый – і гэта дадаткова звяртае ўвагу чытача на колькасную асіметрычнасць дадзеных груп.

Высока ацэньваючы актуальнасць, навізну, навуковую каштоўнасць і практычную вартасць працы, хацелася б пацікавіцца адказамі на некаторыя пытанні, часткова звязаныя са згаданай асіметрыяй і, мяркуем, больш шырока раскрытыя ў поўным тэксце дысертацыі.

1. Колькасць прааналізаваных адзінак – 1100, сярод іх 811 намінацый адмоўных эмоцый, 254 намінацыі станоўчых эмоцый, з якіх, як пазначана ў аўтарэфераце, 118 адносіцца да групы са значэннем радасці. Як колькасна размяркоўваюцца іншыя групы намінацый станоўчых эмоцый? Ці гэта немагчыма вызначыць па прычыне характэрнага для такіх найменняў сінкрэтызму?

2. У якую групу найменняў адмоўных эмоцый размеркавана лексіка, якая перадае прыгнечаны ў сувязі з рознымі прычынамі эмацыянальны стан (напрыклад, *сум, журба, маркота, туга, настальгія, смутак,* а таксама адпаведныя дзеяслоўныя і ад’ектыўныя намінацыі)?

3. У якую групу, на думку дысертанткі, варта аднесці дзеяслоў *шкадаваць* з досыць складанай семантычнай структурай, у якой спалучаюцца, у прыватнасці, як адмоўныя (‘смуткаваць, бедаваць х прычыны чаго-н.’), так і станоўчыя (‘адчуваць жаль, спагаду да каго-н.’) эмацыянальныя значэнні?

Аўтарэферат аформлены згодна з патрабаваннямі ВАК да дысертацый, якія прадстаўляюцца на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук, дакладна адлюстроўвае навуковую пазіцыю дысертанткі, актуальнасць, навізну, мэты і задачы даследавання.

Усё адзначанае дае падставы лічыць, што аўтарэферат дысертацыі Носік Алесі Анатольеўны «Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне» поўнасцю адлюстроўвае аб'ём выкананага даследавання, пацвярджае высокі ўзровень навуковай падрыхтоўкі аўтара, падкрэслівае руплівасць і метадычнасць дысертанткі ў яе комплексным падыходзе да вывучэння праблемы і сведчыць аб тым, што Носік Алеся Анатольеўна заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Загадчык кафедры дадатковай адукацыі
факультэта павышэння кваліфікацыі
і перападрыхтоўкі МДЭІ імя А.Д.Сахарава
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
кандыдат філалагічных навук М.М.Міхалевіч

Подпись Михалевич М.М. удостоверяю.
Юрисконсульт Леонова Е.Л.
14.06.2024